# § 40. Структура сферы паслуг. Геаграфія гандлю і дзелавых паслуг

***Узгадваем.*** *Чаму, акрамя сферы вытворчасці, у свеце ўзнікла і сфера паслуг? Якімі паслугамі вы карыстаецеся ў паўсядзённым жыцці?*

**Структура сферы паслуг.** На этапе пераходу да постіндустрыяльнага этапу развіцця ў эканоміцы павялічваецца роля сферы паслуг, якая забяспечвае ўмовы жыццядзейнасці грамадства, павышэнне ўзроўню жыцця людзей. Яна характарызуецца складанай структурай, дзе прадстаўлена вялікая колькасць відаў эканамічнай дзейнасці. У Міжнароднай класіфікацыі відаў эканамічнай дзейнасці вылучаюць наступныя віды паслуг: гандаль, транспарт, паслугі па часовым пражыванні і харчаванні, інфармацыя і сувязь, фінансавыя і страхавыя паслугі, выдавецкая дзейнасць, навукова-адукацыйныя паслугі, ахова здароўя і сацыяльныя паслугі, турызм, мастацтва і інш. У эканамічнай геаграфіі шмат падыходаў да падзелу сферы паслуг. Умоўна іх можна падзяліць на тры групы: гандаль, дзелавыя і бытавыя паслугі; навукова-адукацыйныя і сацыяльныя паслугі; транспарт і будаўніцтва (мал. 159). Кожны з блокаў мае разгалінаваную структуру і развіваецца высокімі тэмпамі.

**Сфера паслуг**

**Гандаль, дзелавыя і бытавыя паслугі**
- Гандаль
- Сувязь
- Выдавецкая дзейнасць
- Інфармацыя і тэлекамунікацыі
- Фінансавая і страхавая
- Бытавое абслугоўванне
- Паслугі па часовым пражыванні і харчаванні
- Іншыя паслугі

**Навукова-адукацыйныя і сацыяльныя паслугі**
- Адукацыя
- Навуковая дзейнасць
- Ахова здароўя
- Культура і творчасць
- Спорт
- Турызм
- Іншыя паслугі

**Паслугі транспарту**
- Транспартная дзейнасць
- Складзіраванне і дапаможная дзейнасць

Мал. 159. Структура сферы паслуг

Важную ролю ў сферы паслуг традыцыйна адыгрываюць размеркавальныя паслугі — транспарт і гандаль, якія дазваляюць ажыццяўляць абмен рэсурсамі і таварамі. У цяперашні час яны істотна змяніліся: пераўтвораны структуры перавозак, створаны лагістычныя цэнтры, арганізаваны сеткавы гандаль і г. д. У эпоху НТР у сусветнай гаспадарцы з'яўляюцца якасна новыя віды паслуг — інфармацыйна-камунікацыйныя, навукова-даследчыя, банкаўскія і фінансавыя, турысцкія і інш. Інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі ўсё шырэй укараняюцца ва ўсе галіны гаспадаркі. Мабільная сувязь, лічбавыя тэхналогіі, інтэрнэт-гандаль, анлайн-браніраванне гасцініц, білетаў і г. д. — усё гэта новыя паслугі, якія аказваюцца насельніцтву ў цяперашні час.

**Роля сферы паслуг у эканоміцы Беларусі.** Галоўным спажыўцом паслуг выступае насельніцтва, таму геаграфія ўстаноў сферы паслуг залежыць ад асаблівасцей яго размяшчэння. Многія віды паслуг з'явіліся ў выніку развіцця сферы вытворчасці. Асаблівы ўплыў яна аказала на такія віды паслуг, як транспарт і гандаль. У сваю чаргу, сфера паслуг аказвае ўплыў на развіццё прамысловага комплексу. Узровень развіцця сферы паслуг з'яўляецца паказчыкам эканамічнага развіцця краіны. Так, у развітых краінах у сферы паслуг занята большая колькасць жыхароў, чым у сферы вытворчасці. У Беларусі сферай паслуг ахоплена больш за 60 % насельніцтва, занятага ў эканоміцы. Удзельная вага сферы паслуг у структуры ВУП у апошнія гады павялічваецца. У 2017 г. доля сферы паслуг у ВУП склала амаль 47 %.

Галоўнай прыкметай постіндустрыяльнай структуры з'яўляецца павелічэнне долі сферы паслуг у ВУП да 70 %. Пераход да постіндустрыяльнай стадыі адбыўся ў развітых краінах, ажыццяўляе яго і эканоміка Беларусі.

Сфера паслуг лепш развітая ў буйных гарадах Беларусі, аднак яна ўсё шырэй укараняецца ў невялікіх гарадах і сельскіх паселішчах. Рознічны гандаль, мабільная тэлефонная сетка, развіццё сеткі прыгарадных і міжгародніх маршрутных таксі павялічваюць ахоп тэрыторыі і аб'ём аказання паслуг. Паслугі, аказаныя насельніцтву, адрозніваюцца не толькі па відах эканамічнай дзейнасці, але і па перыядычнасці іх аказання. Больш развітой і шчыльнай з'яўляецца сетка прадпрыемстваў і ўстаноў паўсядзённага попыту. У яе ўваходзяць аб'екты рознічнага гандлю (перш за ўсё харчовыя магазіны), установы адукацыі і аховы здароўя, прадпрыемствы грамадскага харчавання і інш. Больш рэдкай з'яўляецца сетка ўстаноў перыядычнага попыту (бібліятэкі, клубы, тэатры, музеі, спецыялізаваныя магазіны, атэлье, рамонтныя майстэрні і г. д.). Для паляпшэння якасці паслуг і іх даступнасці ў краіне распрацаваны *сацыяльныя стандарты*. У структуры відаў эканамічнай дзейнасці вялікая ўдзельная вага гандлю, бытавых і дзелавых паслуг.

**Гандаль.** Адзін з найстарэйшых відаў эканамічнай дзейнасці сферы паслуг, які інтэнсіўна развіваецца ў Беларусі. Колькасць гандлёвых аб'ектаў пастаянна павялічваецца. У сферы паслуг удзельная вага гандлю ў ВУП Беларусі самая высокая і складае 9,7 %, змяняючыся па рэгіёнах краіны ад 8,3 % у Магілёўскай вобласці да 19,4 % у Мінску.

Гандаль падзяляецца на аптовы і рознічны. Аптовы гандаль ажыццяўляе закупку вялікіх партый тавараў для наступнай іх рэалізацыі праз прадпрыемствы рознічнага гандлю. У цяперашні час у Беларусі больш за 15 тыс. арганізацый аптовага гандлю, для якога створана адпаведная інфраструктура. Функцыянуе больш за 9000 спецыялізаваных складскіх памяшканняў, якія ўключаюць склады-магазіны, склады-халадзільнікі, гароднінасховішчы.

Рознічны гандаль набліжаны да месцаў пражывання людзей і мае разгалінаваную сетку. Для размяшчэння аб'ектаў гандлю важнай з'яўляецца крокавая даступнасць магазінаў. Колькасць прадпрыемстваў рознічнага гандлю ў 2017 г. перавысіла 54 000. Гандлёвыя плошчы таксама выраслі амаль у два разы. Звязана гэта з павелічэннем асартыменту тавараў, ростам даходаў насельніцтва і будаўніцтвам буйных гандлёвых аб'ектаў: гіпермаркетаў, супермаркетаў, спецыялізаваных магазінаў.

У Беларусі хуткімі тэмпамі развіваецца сеткавы гандаль, з'яўляюцца такія гандлёвыя сеткі, як «Еўраопт», «Белмаркет», «Гіпа», «Віталюр», «ОМА», «Міла», «5 элемент» і інш. Яны, як правіла, канцэнтруюцца ў буйных гарадах з большай пакупной здольнасцю. Але ў апошнія гады сеткавы гандаль ахоплівае і сельскую мясцовасць, дзе сетка «Еўраопт» адкрыла ўжо больш за 700 магазінаў (мал. 160). У сеткавых магазінах прадаюцца як харчовыя, так і прамысловыя тавары.



Мал. 160. Гандлёвая сетка «Еўраопт»

Вызначце па картах атласа (с. 49), да якой формы ўласнасці адносіцца рознічны гандаль.

Доля прыватнай уласнасці ў рознічным таваразвароце складае больш за 75 %. У агульнай колькасці тавараў, прададзеных праз магазіны, пераважаюць харчовыя — каля 55 %. Рознічны тавараабарот залежыць ад узроўню даходаў насельніцтва, таму лепш развіты ў буйных гарадах, у Мінскім, Салігорскім, Полацкім і іншых раёнах. У апошнія гады ў гандаль усё шырэй укараняюцца сучасныя тэхналогіі. Хуткімі тэмпамі пашыраецца сетка інтэрнэт-магазінаў, расце іх тавараабарот. Вялікія аб'ёмы

продажу ў такіх спецыялізаваных інтэрнэт-магазінах, як «21vek.by», «Lamoda», «Е-дастаўка» і інш. Магазіны ўкараняюць сістэму зніжак, розныя рэкламныя акцыі, сістэму дастаўкі тавараў і г. д.

**Інфармацыя і сувязь.** Найбольш высокімі тэмпамі ў сферы паслуг развіваюцца **інфармацыя** і **сувязь**, або інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі (ІКТ).

**Інфармацыя і сувязь** — від эканамічнай дзейнасці па стварэнні і распаўсюджанні інфармацыйных матэрыялаў, ажыццяўленні тэлекамунікацый, прымяненні інфармацыйных тэхналогій і інфармацыйным абслугоўванні.

На долю ІКТ прыходзіцца больш за 5 % ВУП. Дадзены від эканамічнай дзейнасці, акрамя ўласна тэлекамунікацый, уключае таксама выдавецкую дзейнасць, вытворчасць і ажыццяўленне тэле- і радыёвяшчання, падрыхтоўку кіна- і відэафільмаў і інш. Гэта адзін з відаў паслуг, якія найбольш хутка развіваюцца. Па шэрагу паказчыкаў распрацоўкі і выкарыстання інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій Беларусь займае вядучыя пазіцыі ў свеце. Беларусь па індэксе развіцця ІКТ займае 32-ю пазіцыю ў свеце і з'яўляецца лідарам сярод краін СНД. Доля экспарту камп'ютарных паслуг у агульным аб'ёме экспарту паслуг Рэспублікі Беларусь вырасла ў 2011–2017 гг. у тры разы і склала ў 2017 г. больш за 15 %. З поспехам на сусветны рынак выйшла распрацаваная ў Беларусі масавая анлайн-гульня «World of Tanks» (WoT). У Мінску паспяхова функцыянуе Парк высокіх тэхналогій (ПВТ), які займаецца вырашэннем пытанняў інфармацыйнага абслугоўвання насельніцтва. ПВТ — адзін з вядучых інавацыйных IT-кластараў у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе. Яго рэзідэнтамі выступаюць больш за 140 кампаній, сярод якіх IBA Group, EPAM Systems, «Гейм Стрым» і інш. Яны аказваюць паслугі ў галіне інфармацыйных тэхналогій не толькі ў Беларусі, але і выконваюць заказы больш чым 50 буйнейшых ТНК свету, сярод якіх Microsoft, HP, Coca-Cola, Google, Toyota, Samsung, Mitsubishi, British Petroleum, Лонданская фондавая біржа, Сусветны банк і інш. Каля 85 % праграмнага забеспячэння, якое выпрацоўваецца ПВТ, пастаўляецца за мяжу. Мабільная сувязь, інтэрнэт актыўна ўкараняюцца таксама ў сферу вытворчасці.

На беларускім рынку інфармацыйна-камунікацыйных паслуг лідарам з'яўляецца «Белтэлекам». Паслугі доступу да сеткі Інтэрнэт аказваюць больш за 140 аператараў электрасувязі, чым карыстаецца амаль 75 % насельніцтва краіны. Усю тэрыторыю Беларусі (больш за 98 %) ахоплівае

мабільная сувязь аператараў МТС, Velcom A1 («Вэлком»), life:) («БеСТ»). Развіццё інфармацыйных тэхналогій прывяло да некаторага зніжэння значэння выдавецкай дзейнасці.

**Фінансавая дзейнасць і страхаванне.** У эпоху глабалізацыі важным відам эканамічнай дзейнасці становіцца **фінансавая дзейнасць**. Інвестыцыі — важны фактар размяшчэння вытворчасці.

**Фінансавая дзейнасць** — від эканамічнай дзейнасці, звязаны з атрыманнем і пераразмеркаваннем фінансавых сродкаў, неабходных для вырашэння гаспадарчых і сацыяльных задач.

У краіне з'явілася вялікая колькасць холдынгавых і траставых кампаній, інвестыцыйных фондаў і іншых арганізацый, якія аказваюць фінансавыя паслугі. На мяжы XX і XXI стст. у краіне ўтварыліся банкі, якія аказваюць фінансавыя паслугі ў розных сферах дзейнасці. Цэнтральным банкам і дзяржаўным органам Рэспублікі Беларусь выступае Нацыянальны банк, які падсправаздачны толькі Прэзідэнту краіны. Дадзены банк рэгулюе крэдытныя і грашовыя адносіны ў краіне, забяспечвае функцыянаванне яе банкаўскай сістэмы. На тэрыторыі Беларусі дзейнічае 28 банкаў і крэдытна-фінансавых арганізацый, якія маюць права на ажыццяўленне банкаўскіх аперацый. Буйнейшыя сярод іх — «Беларусбанк», «Белінвестбанк», «Белаграпрамбанк» і інш. Банкамі прадастаўляюцца крэдыты для ажыццяўлення розных эканамічных і сацыяльных праектаў. У апошнія гады расце інвестыцыйная прывабнасць Рэспублікі Беларусь, павялічваецца колькасць банкаў з удзелам замежнага капіталу. Лідарамі сярод іх з'яўляюцца «Прыорбанк», «Банк БелВЭБ» (мал. 161).



Мал. 161. Будынак «Банк БелВЭБ», г. Мінск

Істотна пашырыўся асартымент такіх паслуг, як страхаванне маёмасці, будынкаў, адказнасці камерцыйных арганізацый, медыцынскае страхаванне, страхаванне транспартных сродкаў і г. д. Развіццё страхавання ў Беларусі на мяжы XX і XXI стст. было абумоўлена актывізацыяй прадпрымальніцкай дзейнасці і выхадам на міжнародныя рынкі. На рынку страхавых паслуг працуе больш за 20 кампаній, лідзіруючыя пазіцыі займае «Белдзяржстрах».

Да спажывецкіх адносяцца жыллёва-камунальныя паслугі, бытавыя паслугі па рамонце і абслугоўванні прыбораў і абсталявання, паслугі грамадскага харчавання, часовага пражывання і г. д.

**Абагульнім і запомнім.** У цяперашні час сфера паслуг развіваецца больш высокімі тэмпамі ў параўнанні са сферай вытворчасці.

Вядучымі яе відамі эканамічнай дзейнасці з'яўляюцца гандаль, транспарт і інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі. Адны з відаў эканамічнай дзейнасці сферы паслуг, якія найбольш хутка развіваюцца, — інфармацыя і сувязь.

1. Па якім прынцыпе вылучаецца структура сферы паслуг? 2. Якія прадпрыемствы і ўстановы сферы паслуг Беларусі адносяцца да катэгорыі паўсядзённага попыту, а якія — перыядычнага? 3. Чаму гандаль мае высокую ўдзельную вагу ў ВУП краіны? 4. Чаму такімі хуткімі тэмпамі развіваюцца інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі?

5. Назавіце буйнейшыя гандлёвыя комплексы вашай мясцовасці і вызначце выгаднасць іх размяшчэння. 6. Чым тлумачацца структурныя змены сферы паслуг? 7. Якія новыя віды эканамічнай дзейнасці сферы паслуг узнікаюць у цяперашні час і якія могуць узнікнуць у бліжэйшы?

***Ад тэорыі да практыкі.*** У Беларусі і Латвіі ў 2021 г. пройдзе чэмпіянат свету па хакеі. Распрацуйце для Беларусі міні-праект па арганізацыі паслуг па часовым пражыванні і харчаванні для замежных турыстаў, якія наведаюць чэмпіянат свету па хакеі.

## § 41. Геаграфія навукова-адукацыйных і сацыяльных паслуг

***Узгадваем.*** *Якія ступені адукацыі вы ўжо прайшлі і якія плануеце пераадолець? Якія ўстановы культуры вы наведвалі?*

Важнай складовай часткай сацыяльнага комплексу паслуг з'яўляюцца навукова-адукацыйныя і сацыяльныя паслугі. Па ўдзельнай вазе ў аб'ёме платных паслуг яны істотна саступаюць гандлю і дзелавым паслугам, але інтэнсіўна развіваюцца ва ўмовах пераходу да постіндустрыяльнага грамадства. Уключаюць некалькі відаў эканамічнай дзейнасці: адукацыю, навуковую дзейнасць, ахову здароўя, культуру, спорт, турызм.

**Адукацыя.** Беларусь мае развітую сістэму адукацыі. Узровень пісьменнасці дарослага насельніцтва, паводле звестак перапісу 2009 г., складае 99,6 %, ахоп базавай, агульнай сярэдняй і прафесійнай адукацыяй занятага насельніцтва — 98 %. Па большасці паказчыкаў, колькасці студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі на 10 тыс. насельніцтва Беларусь знаходзіцца на ўзроўні развітых краін Еўропы. Установы адукацыі размешчаны раўнамерна па ўсёй краіне. Сістэма адукацыі ўключае ўстановы, якія дазваляюць рэалізоўваць адукацыйныя праграмы рознага ўзроўню (мал. 162).